периферии поля побудительности. Отличие ядра от периферии в том, что оно концентрирует максимальное количество признаков доминанты, в то время как периферийные конституенты обладают более ограниченным числом таких признаков. К ядерным конституентам поля побудительности относятся такие морфологические и лексико-грамматические средства выражения побудительности как индикатив, инфинитив, инклюзивные императивные конструкции, конструкции с модальными глаголами и глаголом lassen, haben + zu + Infinitiv, sein + zu + Infinitiv.

В периферию поля побудительности входят: конъюнктив, причастие П, пассив индикатива, конструкции с глаголами побудительной семантики, именные наречные, вопросительные предложения. Все это – синтаксические средства выражения побудительности. К периферии можно также отнести слова и словосочетания, описывающие мимику и жесты побуждения.

Значительное место при изучении поля побудительности отводится и побудительному контексту. Он выступает в виде комплекса различных языковых средств, способствующих выявлению и разграничению оттенков значения побудительности. В том числе, если языковое средство выражает побуждение в своем основном значении, побудительный контекст может усиливать или же ослаблять побуждение. Когда языковая единица передает побуждение в своем побочном значении, контекст играет решающую роль и является основным фактором формирования побудительного смысла.

В целом следует отметить, что рассмотрение и описание функционально-семантического поля побудительности представляет не только большой теоретический интерес, но и имеет большое практическое значение, т.к. такой подход к языку соответствует естественным условиям человеческого общения и способствует выработке динамического стереотипа.

## ДА ПЫТАННЯ ВЫЗНАЧЭННЯ ГІСТАРЫЧНАЙ СТЫЛІСТЫКІ

***С. Л. Каган***

Навуковы кіраўнік – д.філал.н., прафесар ***А. А. Станкевіч***

*Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны*

Вялікае значэнне для гісторыі беларускай літаратурнай мовы, якая займаецца вывучэннем працэсу гістарычнага станаўлення беларускай пісьмовай мовы на працягу ўсяго часу яе існавання, мае, перш за ўсё, непасрэдны разгляд пісьмовых помнікаў розных этапаў яе развіцця. У першую чаргу важным тут з'яўляецца аналіз мовы тых ці іншых старажытных помнікаў на розных узроўнях (фанетычным, лексічным, марфалагічным, сінтаксічным і г. д.), што ў комплексе дазваляе зрабіць высновы аб дамінуючай моўнай стыхіі твора, вызначыць заканамернасці ўжывання тых ці іншых адзінак, акрэсліць абумоўленасць іх выкарыстання рознымі лінгвістычнымі і пазамоўнымі фактарамі. Акрамя таго, вышэйназваная дысцыпліна разглядае ў дыяхранічным аспекце сістэму стыляў беларускай літаратурнай мовы: шляхі фарміравання і эвалюцыю моўных адзінак, якія ствараюць стылёва-вызначальныя рысы справавога, навуковага, публіцыстычнага і мастацкага стыляў.

Аднак такое даследаванне моўных сродкаў твораў мастацкай літаратуры, хаця і дае магчымасць гаварыць аб тым, што з'яўляецца асновай мовы кожнага помніка, рысы якой моўнай стыхіі ў ім пераважаюць, як адлюстраваны ў творы іншамоўныя ўплывы, не дазваляе, тым не менш, зразумець адметнасці творчай індывідуальнасці аўтара, асэнсаваць непаўторнасць стылёвай манеры пісьменніка, вызначыць, якую ролю адыграў той ці іншы творца ў працэсе гістарычнага развіцця "прыгожага пісьменства".

Менавіта таму неабходна гаварыць аб вылучэнні ў асобны раздзел дыяхранічнага мовазнаўства гістарычнай стылістыкі, асноўнай задачай якой у адносінах да твораў старажытнай мастацкай літаратуры будзе не толькі вызначэнне і сістэматызацыя сродкаў мастацкай выразнасці, якія вылучаюцца сёння апісальнай стылістыкай у кожным творы (эпітэт, метафара, градацыя, паралелізм, анафара, эпіфара, гіпербала, літота, перыфраза і г. д.), але і:

вызначэнне, апісанне і класіфікацыя стылістычных прыёмаў, якія сустракаліся ў старажытных творах пэўнага перыяду, але не захаваліся па розных прычынах у сучаснай літаратуры (стылістычная сіметрыя, ампліфікацыя, перыяд і г. д.);

комплексны аналіз вобразна-выяўленчых адзінак, што выкарыстоўваліся тым ці іншым

аўтарам ў супастаўленні з творамі пісьменнікаў-сучаснікаў, папярэднікаў і наступнікаў, які дасць магчымасць рэальна акрэсліць адметнасці стылю кожнага творцы, вызначыць вытокі яго індывідуальнасці, зразумець яго асабісты ўклад у развіццё мовы мастацкай літаратуры;

разгляд стылістычных асаблівасцей розных жанравых форм як пэўных устойлівых стылёвых мадэляў на працягу ўсяго часу іх існавання, змен у іх складзе і г. д.

Такім чынам, гістарычная стылістыка павінна разглядацца як асобная частка гістарычнага мовазнаўства, якая мае акрэслены прадмет даследавання і канкрэтныя задачы. Зразумела, што такі падыход да аналізу старажытных твораў мастацкай літаратуры адкрые новыя магчымасці не толькі для гісторыкаў мовы, але і для прадстаўнікоў апісальнай стылістыкі, якія даследуюць стылёвыя адметнасці твораў сучасных беларускіх празаікаў і паэтаў.

## МЕТАДАЛОГІЯ НАРАДЖЭННЯ ВОБРАЗАЎ У ТВОРЧАСЦІ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

*В. В. Кляўззе*
Навуковы кіраўнік – ***Г. А. Смалянка***
*Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт*

Асноўнай лініяй усей працы стала меркаванне, што велічыня і значэнне У.Караткевіча не даюць нам права характарызаваць яго творы толькі з пункту гледжання іх мастацкасці, лаканічнасці або насычанасці. Дадзены факт не выклікае ніякага сумлення.

У працы разглядаўся перыяд, які папярджнічаў напісанню таго ці іншага твора, а менавіта сукупнаскь фактараў, якія склаліся вакол і уплывалі на Уладзіміра Караткевіча. Адным словам, чаму аўтар пісаў на тую ці іншую тэму. Асноўная частка працы падзелена на чатыры разделы, у кожным з якіх даецца падрабязны аналіз той ці іншай тэматыкі ў творах Караткевіча з аднаго боку, і прыводзіцца адмысловы від метадалогіі нараджэння гэтых вобразаў.

У працы разглядаецца гістарычная, грамадзянская, містычна-замагільная і язычніцкая тэматыка твораў Караткевіча. Асабліва значнае месца адводзіцца дзвюм апошнім, у сувязі са слабай распрацаванасцю іх у іншай крытыцы. Справа ў тым, што, вывучаючы творчасць Караткевіча, мы наткнуліся на вершы вельмі дзіўнай тэматыкі. Самае цікавае, што іх у аўтара вялікае мноства. Гаворка ідзе аб нетрадыцыйнай для класічных беларускіх паэтаў вобразнасці (смерць, Страшны суд, канец света і іншае).

Продкі беларусаў мелі розныя рэлігіі: каталіцызм, пратэстанізм, праваслаўе. Аднак з самага пачатку ўсе яны былі язычнікамі. Таму, як бы язычніцтва не выбівалася з думак у розныя эпохі, трошкі яно засталося. Цікава, а як разумелі язычнікі свет? Свет апісваўся сістэмай асноўных утрыманых двайчных супрацьпастаўленняў (бінарных апазіцый), азначаўшых прасторавыя, часавыя, сацыяльныя яго характарыстыкі.

Дуалістычны прынцып супрацьпастаўлення спрыяльнага-неспрыяльнага для калектыву рэалізоўваўся часам у міфалагічных персанажах, падзеленых станоўчымі ці адмоўнымі функцыямі. Такія, як шчасце (доля) – няшчасце (нялодя), поўнач – поўдзень, цот – няцот, чорнае – белае, жыцце – смерць. Бачыце, усе грунтуецца яшчэ на дахрысціянскім узроўні. Гэта язычніцкая сістэма прайшла скрозь стагоддзі і праявілася ў творчасці Караткевіча.

Паэт заўседы гнаўся за чымсьці неардынарным, яскравым, неадназначным. У жыцці чалавека есць дзве асноўныя падзеі: нараджэнне і смерць. Караткевіч, напэўна, лічыў нараджэнне пройдзеным этапам, таму пісаў пра смерць. Гэта моцны вобраз, таму што перад тварам смерці чалавек заўседы становіцца максімальна шчырым. Увагі заслугоўваюць спробы параўняць творчыя метады Уладзіміра Караткевіча і знакамітых мастакоў Пітэра Брэйгеля, Геранiма Босха, Франсіска Гойі, Сальвадора Далі. Таксама робіцца аналіз чыста язычніцкай вобразнасці ў творах Караткевіча. З'яўленне падобнай тэматыкі грунтуецца таксама яшчэ на дахрысціянскім узроўні, а менавіта ў кульце балтаў і славян.

Безумоўна, Караткевіч сам не адчуваў сябе залежным ад нейкіх гістарычных і псіхалагічных абставін. Але ў думках фарміравалася ўсведамленне таго, што, менавіта, ен, Караткевіч, дзіця гісторыі, у ім ўтрымліваецца памяць продкаў.